

**Янка Маўр** (сапр. Іван Міхайлавіч Фёдараў) нарадзіўся 11 мая (29 красавіка) 1883 у г. Лібаве (Латвія). Адзін з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, заснавальнік прыгодніцкага і навукова-пазнавальнага жанраў у беларускай літаратуры, стваральнік першай беларускай навукова-фантастычнай аповесці. Аўтар кніг для дзяцей, п’ес, перакладаў.

Нарадзіўся ў сям’і выхадца з Беларусі. Яго бацька быў адстаўным салдатам, паходзіў з беззямельных беларускіх сялян, працаваў сталяром. Да ваеннай службы ён насіў прозвішча Ільін, а прозвішча Фёдараў з’явілася ў выніку памылкі армейскага пісара, які запісаў Міхаіла Фёдаравіча – Міхаілам Фёдаравым.



*Я. Маўр - семінарыст Панявежскай настаўніцкай семінарыі 1899 г.*

Бацька рана памёр, і маленькі Іван разам з маці пераехаў на яе радзіму – у вёску Лебянішкі (былой Ковенскай губерні). Яны жылі ў беднасці, і толькі дзякуючы намаганням маці, якая марыла даць адукацыю сыну, у **1895** годзе ён скончыў пачатковую школу, а ў **1899** – Ковенскае рамеснае вучылішча. Пасля вучылішча ён паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю. У канцы **1902** г. яго выключылі з апошняга, выпускнога класа – за вальнадумства і «за сумневы ў рэлігіі». Тым не менш, у **1903** годзе ён усё ж атрымаў пасведчанне настаўніка пачатковай школы, здаўшы экстэрнам экзамены за семінарскі курс. Пасля навучання ў настаўніцкай семінарыі Фёдараў пачаў працаваць у школе пад Панявежам у мястэчку Наўямесціс, а потым яго перавялі ў вёску Бытча на Барысаўшчыне.



Я.Маўр – памочнік настаўніка пачатковай школы ў мястэчку Новае Места (Літва)

У **1906** годзе ён прыняў удзел у нелегальным педагагічным з’ездзе, які адбыўся на Мікалаеўшчыне. У гэтым жа з’ездзе прыняў удзел і будучы класік беларускай літаратуры Якуб Колас. У «Працоўным спісе», які захаваўся ў архіве пісьменніка, адзначаны вынік гэтай падзеі для яго ўдзельніка: «1906. VIII. Звольнены са службы і аддадзены пад суд…». Разам з Якубам Коласам і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі быў аддадзены пад суд, пазбаўлены права выкладаць у школе і ўзяты пад нагляд паліцыі.

Судовае разбіральніцтва па справе аб настаўніцкім з’ездзе доўжылася амаль два гады. Фёдарава адхілілі ад педагагічнай дзейнасці і ўзялі пад нагляд паліцыі. Пасля звальнення з працы Янка Маўр уладкоўваецца хатнім настаўнікам для дзяцей Варвары Фёдараўны Адамовіч, дачкі святара. Сям’я Варвары жыла ў Турцы, туды і пераязджае малады настаўнік.

Пасля смерці мужа Варвары пайшлі перасуды: недапушчальна маладому чалавеку жыць у адной хаце з удавой. Настаўнік проста апынуўся перад выбарам – ці з’ехаць з дому і шукаць работу, ці ажаніцца. У **1909** годзе яны абвянчаліся.



Працуючы хатнім настаўнікам Іван Фёдараў не губляў час і завочна вучыўся ў Віленскім універсітэце. Экстэрнам здаў экзамены і атрымаў права выкладаць гісторыю і геаграфію. І ў **1911** годзе ён пераязджае са сваёй сям'ёй у Мінск, дзе яму пашанцавала ўладкавацца нелегальна ў прыватную гандлёвую школу. На сваіх уроках гісторыі і геаграфіі ён вандраваў разам з вучнямі па геаграфічнай карце, завочна адпраўляўся ў далёкія краіны або ў глыб вякоў, у сівую мінуўшчыну. Ён быў сапраўдным капітанам дзіцячых падарожжаў. Усе вучні верылі, што настаўнік усё гэта бачыў сваімі вачамі, быў сведкам усіх падзей, аб якіх расказваў. На самой справе Янка Маўр ніколі не выязджаў за межы Савецкага Саюза.

Усе веды ён атрымліваў з кніг, якія збіраў на працягу многіх год, часта адмаўляючы сабе ў многім.

Як успамінала дачка Янкі Маўра, Наталля, яго бібліятэка на той час у Мінску была адной з лепшых: «Адна сценка пакоя ад падлогі да столі была застаўлена паліцамі з кнігамі. Тут былі энцыклапедыі Бракгаўза і Эфрона, першы выпуск Вялікай Савецкай Энцыклапедыі, «Жыццё жывёл» Брэма, кнігі вядомых вандроўнікаў. Многа кніг было па гісторыі. Але больш усяго было мастацкай літаратуры – зборы твораў Пушкіна, Лермантава, Жукоўскага, Талстога, Тургенева, а таксама Марка Твэна, Джэка Лондана, Жуля Верна, Вальтэра Скота, Уільяма Шэкспіра і шматлікіх іншых аўтараў. Бацька вельмі перажываў страту гэтай бібліятэкі ў час вайны».



У **1911** годзе нарадзіўся першы сын – Фёдар. Пачалася Першая сусветная вайна, сям'я эвакуіруецца ў Сібір. Там, у Томску, нарадзіўся другі сын – Арсень (1917 г.). Пасля вызвалення Беларусі сям'я вяртаецца ў Мінск, Іван Фёдараў уладкоўваецца настаўнікам геаграфіі і гісторыі ў чыгуначную школу. Пасля народзін дачкі Аляксандры (1919 г.) Варвара Фёдараўна цяжка захварэла і восенню 1919 года памерла.



Праз год Янка Маўр ажаніўся з Стэфанідай Аляксандраўнай Шылёнак, сястрой Марыі Шылёнак, якую запрасілі даглядаць за хворай Варварай і яе малымі дзецьмі. Стэфаніда стала добрай маці для дзяцей Івана Фёдарава. У 1924 годзе ў іх нарадзілася дачка *Наталля, якая значна пазней выйшла замуж за малодшага сына Якуба Коласа Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча.*

У **1920-я** працаваў у Наркамаце асветы Беларусі і ў Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы.

Працу настаўніка Фёдараў пакінуў толькі ў **1930** годзе, калі перайшоў на працу ў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (дзе прапрацаваў да 1936 года). З 1930 на творчай працы. *Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1934).*



У друку выступіў у **1923** г., змясціўшы ў газеце «Советская Белоруссия» і ў ленінградскім часопісе сатыры і гумару «Бегемот» фельетоны. Да таго часу была ўжо напісана аповесць «Чалавек ідзе» (надрукавана ў **1926-1927** гг. у дзіцячым часопісе «Беларускі піянер», асобным выданнем выйшла ў 1927 г.). Аповесць паклала пачатак фантастычнаму і прыгодніцкаму жанрам у беларускай літаратуры. Сам аўтар вельмі хваляваўся, ці прымуць рэдакцыя і чытачы гэты твор, бо ў ім не было нічога піянерскага. Але аповесць спадабалася. Яе з захапленнем чыталі вучні, іх бацькі, настаўнікі, пісьменнікі. Народны паэт




Беларусі Янка Купала гаварыў, што ён быў адным з першых чытачоў аповесці «Чалавек ідзе» і потым іншых кніг пісьменніка. Аповесць захапіла сваёй навізной і незвычайнасцю, нават і імя аўтара Янка Маўр, якім падпісаўся І.Фёдараў было незвычайным і загадкавым. «Янка» – гэта беларускі аналаг імя «Іван». Як паказвала даследчыца творчасці Янкі Маўра беларуская літаратуразнаўца Эсфір Гурэвіч, пісьменнік, захаваўшы сваё сапраўднае імя ў першай частцы псеўданіма, недвухсэнсоўна паказваў на тое, што ён – сын беларускай зямлі. Значэнне псеўданіма «Маўр» шырока адкрыецца ў яго наступных аповесцях: «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», у якіх ён паказаў сябе як абаронца правоў каланіяльных і залежных народаў, са спагадай ставіўся да карэнных народаў Паўночна-Заходняй Афрыкі.

За час літаратурнай дзейнасці выдаў шмат твораў для юных чытачоў: аповесці «У краіне райскай птушкі» і «Сын вады» (1928), «Палескія рабінзоны» (1930, аповесць экранізавана ў 1935), «Слёзы Тубі» (1930), «Аповесць будучых дзён» (1932), «ТВТ» (1934), «Вакол свету» (1947), «Шлях з цемры» (1948), «Апавяданні» (1951), «Аповесці і апавяданні» (выбранае, 1954), «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» (часопіс «Маладосць», 1954-1955), «Аповесці і апавяданні» (1969), апавядання «Цётка Эмілія» (1954), байкі «Пекла» (1929), рамана «Амок» (1930) - *першы беларускі раман для дзяцей* Я.Маўра. У яго аснове ляжаць гістарычныя падзеі – паўстанне на востраве Ява ў 1926 годзе. А напісаць раман дапамагла папулярная ў той час штучная мова свету, якая была створана ў 1887 годзе варшаўскім акулістам Лазарам Заменгофам. Псеўдонім Заменгофа — **Esperanto** («Той, хто спадзяецца») — вельмі хутка стаў назвай самой мовы. Эсперанта – штучная мова, прызначаная для міжнароднага карыстання.





HEROLDO
DE ESPERANTO

Янка Маўр быў вядомым эсперантыстам. Эсперанта ён пачаў вывучаць яшчэ ў 1904 годзе. У 1926 годзе ён вёў перадачу для эсперантыстаў на беларускім радыё. Быў ганаровым старшыней (1957-1971 гг.) арганізацыі беларускіх эсперантыстаў.

Знаёміў Янка Маўр беларускіх чытачоў і з сусветнай літаратурай. У яго перакладзе на беларускую мову выйшлі творы Р.Кіплінга, М.Твэна, Ж.Верна, В.Гюго, казкі Г.Х.Андэрсэна.

Памёр Я. Маўр 3 жніўня 1971 года на 89-м годзе жыцця. Пахаваны ў Мінску. На магіле пісьменніка пастаўлены арыгінальны помнік (скульптар І. Міська): над цёмнай мармуровай плітой нібы трапеча белы ветразь... Гэтую дэталь успрымаеш як увасабленне рамантычнай захопленасці Я. Маўра жыццём, як сімвал таго, што гэты таленавіты пісьменнік сваёй творчасцю вынес беларускую дзіцячую літаратуру далека наперад, актыўна садзейнічаў яе паскоранаму развіццю.



*Магіла Я. Маўра*

За поспехі ў галіне літаратуры і грамадскай дзейнасці Я. Маўр узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі. У 1968 годзе яму было нададзена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР, а ў 1972 годзе Я. Маўр першы з беларускі дзіцячых пісьменнікаў быў адзначаны (пасмяротна) Дзяржаўнай літаратурнай прэміяй БССР.

Яго імем названы вуліца, бібліятэка ў Мінску, Бытчанская школа на Барысаўшчыне.

Я. Маўр — пісьменнік-класік, ён не толькі ўзбагаціў беларускую дзіцячую літаратуру новымі тэмамі, своеасаблівымі жанрамі, а і пашырыў яе абсягі, далучыў да агульных кантактаў з сусветнай дзіцячай літаратурай.



*Я. Маўр і Я. Колас з агульным унукам Сяргеем. 1950-гг.*






*Я. Маўр і Я. Колас у час сяброўскай бяседы. 1950 г.*






*Я. Маўр з Васем Вясёлкіным, падараваным яму супрацоўнікамі часопісу "Вясёлка" ў дзень 70-годдзя. 1953 г.*






*Я. Маўр з жонкай Стэфанідай Аляксандраўнай. 1953 г.*






*Я. Маўр з жонкай Стэфанідай Аляксандраўнай і ўнукамі. 1955 г.*

**Літаратурная гадзіна «Капітан нашых падарожжаў»**

*да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра*

*Падрыхтоўка:* прачытаць біяграфію Янкі Маўра і яго кнігу «Грот Афаліны».

*Бібліятэкар.* Мы сёння з вамі сустрэліся, каб адзначыць юбілей знакамітага і таленавітага, любімага ўсімі дзецьмі беларускага пісьменніка Янкі Маўра. Творчасць яго – з'ява адметная ў беларускай літаратуры. Пісьменнік з'яўляецца заснавальнікам прыгодніцкай літаратуры і адным з першых прадстаўнікоў гістарычнай літаратуры. Янка Маўр смела адкрываў перад сваімі чытачамі вялікі свет ведаў, тлумачыў нават складаныя палітычныя пытанні, запрашаў у падарожжа. Вось і сёння мы адправімся ў падарожжа па старонках цікавых кніг Янкі Маўра.

Вам было заданне падрыхтаваць біяграфію пісьменніка, і цяпер мы распачынаем першы конкурс. За кожны правільны адказ вы атрымліваеце жэтон, а ў канцы літаратурнай гадзіны пераможца атрымае прыз.

**Першы конкурс «Біяграфічны»**



1. Дзе і калі нарадзіўся Янка Маўр? (Нарадзіўся 11.05.1883 г. у горадзе Лібава (цяпер горад Ліепая), Латвія).

2. У якой сям'і нарадзіўся Янка Маўр? (У сям'і сталяра).

3. Дзе правёў сваё дзяцінства пісьменнік? (На радзіме маці – ў вёсцы Лебянішкі Ковенскай губерні (цяпер Летува).

4. Якое сапраўднае імя пісьменніка? (Іван Фёдараў).

5. Якую адукацыю атрымаў пісьменнік? (Скончыў пачатковую, затым рамесную навучальню ў Коўне, а ў 1899 г. паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю, але быў выключаны за ўдзел у гуртку рэвалюцыянераў, а ў 1903 г. здаў экстэрнам экзамен і атрымаў званне настаўніка пачатковай школы).

6. Дзе адразу пасля атрымання адукацыі працаваў пісьменнік? (Працаваў памочнікам настаўніка ў Новым Месцы (Летува), у вёсцы Бытча на Барысаўшчыне).

7. За што быў пазбаўлены права выкладаць у школе? (У 1906 г. удзельнічаў у нелегальным з'ездзе рэвалюцыйна настроеных настаўнікаў у вёсцы Мікалаеўшчына і разам з Якубам Коласам і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі быў аддадзены пад суд, пазбаўлены права выкладаць у школе і ўзяты пад нагляд паліцыі).

8. У якім годзе Янку Маўру зноў удалося ўладкавацца на працу настаўніка? (Толькі ў 1911 г. выкладчыкам геаграфіі і гісторыі ў Менскую прыватную гандлёвую школу).

9. Дзе яшчэ працаваў Янка Маўр? (У Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, у Наркамаце асветы БССР, у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. З 1930г. быў на творчай працы).

10. Ці мае Янка Маўр дзяржаўныя ўзнагароды і званні? (Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі, ён заслужаны дзеяч культуры БССР (1968 г.).

11. Калі памёр пісьменнік? (Памёр 03.08.1971 г.).

12. У якіх перыядычных выданнях перш за ўсё друкаваўся пісьменнік? (У 1923 г. у газеце «Савецкая Беларусь» і ленінградскім часопісе «Бегемот» друкаваў фельетоны, а з першай аповесцю выступіў у друку ў 1926 г. у часопісе «Беларускі піянер»).

13. Пералічыце творы Янкі Маўра, якія вы ведаеце? («Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «Палескія рабінзоны», «Слезы Тубі», «Аповесць будучых дзён», «ТВТ», «Вакол свету», «Шлях з цемры», «Грот Афаліны», «Апавяданні», «Аповесці і апавяданні», «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», апавяданне «Цётка Эмілія»).

14. Ці пісаў пісьменнік вершы? (Не, толькі байкі, якія ўвайшлі ў зборнік «Пекла»).

15. Які раман напісаў пісьменнік? (Раман «Амок»).

16. Ці былі творы Янкі Маўра экранізаваны? (Так, «Палескія рабінзоны»).

17. Якія п'есы напісаў пісьменнік? («Памылка», «Хата з краю», «Балбатун»).

20. Ці працаваў перакладчыкам Янка Маўр? (Пераклаў на беларускую мову асобныя творы Г. К. Андэрсэна, Д. Маміна-Сібірака, М. Прышвіна, А. Чэхава, Р. Кіплінга, М. Твэна, Ж. Верна, В. Гюго, А. Гайдара, В. Шклоўскага, А. Конанава).

21. За якія творы Янка Маўр быў удастоены звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР? (За аповесці «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «Палескія рабінзоны», «ТВТ», «Шлях з цемры», раман «Амок»).

**Другі конкурс «Як гэта было»**

*Бібліятэкар.* Вы прачыталі цікавую гістарычную аповесць «Чалавек ідзе». Я проста ўпэўнена, што яна вам спадабалася. Галоўныя героі аповесці не толькі людзі, але і жывёлы. Прачытаўшы аповесць, вы, напэўна, адчулі сябе вельмі адукаванымі і смелымі ў параўнанні з тымі людзьмі, пра якіх піша аўтар. Вы з першых старонак гэтага твора адчулі здзіўленне: як гэта людзі не умеюць гаварыць, і нават смяяцца і плакаць? Чалавек нічога гэтага не умее яшчэ рабіць, але ён усё роўна адрозніваецца ад малпаў. І, як вы заўважылі, паступова ён пачаў карыстацца працай, і толькі гэта пачало развіваць у яго ўсе іншыя рэфлексы. У форме цікавай экскурсіі напісана гэтая цудоўная аповесць. Цяпер выявім, як уважліва вы чыталі гэтую незвычайную кнігу.

1. Па якой прычыне першабытных людзей можна было пераблытаць з малпамі? (Яны былі пакрыты поўсцю, маленькага росту і з доўгімі рукамі).

2. Чым гэтыя людзі адрозніваліся ад малпаў? (Хадзілі на дзвюх нагах і мелі вялікія галовы).

3. Што здзівіла б усіх, хто ўбачыў бы першых людзей? (Яны ішлі з пустымі рукамі, і толькі жанчыны неслі дзяцей).

4. Колькі асоб было ў гуртку? (25-30 асоб).

5. Па якой прычыне першых людзей можна было прыняць за нямых? (Яны не ўмелі гаварыць).

6. Якое адзінае слова вымаўляў важак гуртка, і што яно азначала? (Слова «га». Яно азначала: сюды, збірайцеся, глядзі, ідзем, стой, пачакайце і многае іншае).

7. Дзе першыя людзі гатавалі сабе ежу? (Яны ўсё елі сырым, нават мяса).

8. Дзе першыя людзі начавалі і хаваліся ад дзікіх жывёл? (Залазілі на высокія дрэвы і там спалі).



9. Ці смяяліся першыя людзі? (Не, яны яшчэ не ўмелі смяяцца).

10. Якое здарэнне ўзбудзіла ўсіх першых людзей? (На жанчыну з дзіцём напаў паранены насарог, ён растаптаў дзіця, а жанчыну падкінуў уверх; яна разбілася насмерць).

11. Якія жывёлы былі падобныя да свіней і малых сланоў і чаму першыя людзі іх не баяліся? (Тапіры, яны былі не драпежныя).

12. Як людзі разбіралі аленя, у іх не было нават нажоў? (Рукамі і зубамі).

13. Па якой прычыне, насыціўшыся і супакоіўшыся, першыя людзі выглядалі вельмі страшнымі? (Іх твары і рукі былі ў крыві).

14. Якім чынам гіены, якіх усю ноч ад здабычы адганялі першыя людзі, усё ж насыціліся мясам? (Яго кінуў мастадонт, падцапіўшы аленя біўнямі).

15. Дзякуючы чаму першыя людзі пачалі думаць і выратавалі чалавека, які тануў у балоце? (Дзяўчынка першая працягнула Крагу жэрдку, і астатнія сталі ёй дапамагаць).

16. З-за чаго людзі першы раз заплакалі? (Яны шкадавалі, што пагас агонь, які загарэўся з маланкі; ім стала дрэнна без агню).

17. Якое адкрыццё зрабіў хлопчык Ра, калі з кастра дастаў палаючую галіну? (Што ёю можна збіваць лісце з дрэў і нават забіць змяю).

18. Што здарылася, калі хлопчыкі ляглі спаць у гняздзе малпаў? (Яны доўга праспалі, і людзі з іх гуртка ўжо былі далёка).

19. Па якой прычыне першыя людзі засталіся каля ракі і не хацелі больш падарожнічаць? (Там было многа птушак, звяроў, смачная вада, расліны і лясныя плады).

20. Якая з'ява прыроды так напалохала першых людзей? (У рацэ вада бурліла, і яна была такая гарачая як вар, а рыба плавала мёртвай).

21. Чаму ў той дзень людзі, якія сабралі рыбу, былі такімі шчаслівымі? (Яны першы раз паспрабавалі згатаваную рыбу. Хоць яна была і недаваранaя, але ім было вельмі смачна, нічога смачней яны не елі).

22. Якая ў першых людзей з'явілася першая гаспадарчая прылада, якую яны не выкінулі, а захавалі? (Востры камень для рэзкі мяса, які ім служыў нажом).

23. Як упершыню людзі прымянілі зброю і ў якім выпадку? (Кракадзіл напаў на хлопчыка, а дарослыя схапілі кійкі-косці, пабілі яго і выратавалі дзіця).

24. Па якой прычыне першыя людзі пакінулі гэты багаты куток? (Смярдзела ўсюды дохлай рыбай і жывёламі, а вада была не прыгоднай для піцця).

25. Чаму людзі не маглі застацца ў цёплай пячоры, куды яны схаваліся ад буры? (Туды зайшоў леў і так зароў, што людзі як звар'яцелыя ўцякалі з гэтага ўтульнага месца).

26. Якім чынам хлопчыкі якія адсталі паспрабавалі смажанага мяса? (Яны даганялі труса, а ён, кінуўшыся на каменні, засмажыўся).

27. Па якой прычыне камяні былі такімі гарачымі? (Яны былі выкінуты з лавы вулкана).

28. Чаму хлопцы не маглі адысціся ад гарачых каменняў? (Ім спадабалася самім распальваць агонь і палохаць ім жывёл. Яны здагадаліся, што жывёлы вельмі баяцца агню).

29. Па якой прычыне хлопцы пачалі ўсміхацца? (Яны самі навучыліся распальваць касцёр / смажыць мяса).

30. Дзе хлопцы зрабілі сабе прытулак і чым гэта скончылася? (У пячоры, дзе жыў леў. Там іх знайшлі людзі з гуртка, і яны вельмі ўзрадаваліся, калі ўбачылі касцёр, а яшчэ больш, калі леў, спалохаўшыся агню, ўцёк з пячоры).

**Трэці конкурс «Знайдзі радкі ў кнізе»**

1. Які выгляд мелі першабытныя людзі? («Галава доўгая, выцягнутая спераду назад, а зверху нібы прыплюснутая. Ілба бадай зусім няма, а як і ёсць, дык не разбярэш, дзе ён пачынаецца. Нос таксама пляскаты, пераноссе ледзь прыкметнае. Вочы сядзяць надта глыбока, а косць над імі выступае наперад, як страха. Падбародак ледзь вызначаецца, а вялізныя скiвiцы высунуліся наперад, як і ў кожнага добрага звера»).



2. Як першыя людзі спатолілі смагу? («... лажыліся на жывот і, апусціўшы галаву, пілі проста з крыніцы»).

3. Якія жывёлы называліся мастадонтамі? («Жывёлы гэтыя, хоць і падобныя былі да нашых сланоў, але ростам пераўзыходзілі іх прынамсі ў два разы. Даўжыня іх цела дасягала васьмі-дзесяці метраў. Галава была даўжэйшай, як у сланоў, а хобат значна карацейшы. Галоўнай адзнакай

былі біўні»).

4. Як можна было вызначыць у гуртку важака? Чым ён адрозніваўся ад другіх першых людзей? («... ён у бядзе першы кідаўся на ворага, калі ён заўважаў небяспеку, папярэджваў аб ёй, калі ён клапаціўся аб усім гуртку»).

**Чацвёрты конкурс «Даведайся, які гэта твор»**

1. Галоўны герой кнігі місіянер Саку. Пасля місіянерскай школы Саку пайшоў у паселішча да сваіх аднапляменнікаў, каб навучыць іх, што трэба любіць і шанаваць усіх людзей. Дзеянні праходзяць на востраве Новая Гвінея, гэта самы вялікі востраў на зямлі. Пяць такіх краін, як наша Беларусь, змясцілася б на ім. На гэтым востраве жыве мала людзей, мала жывёл, але многа расце раслін і дрэў. Чытаючы гэтую кнігу адразу прыходзіць мара пра тое, як добра было б падарожнічаць па гэтым востраве, як па ім падарожнічаў пісьменнік. Але Янка Маўр ніколі не быў на гэтым востраве, а такія грунтоўныя веды ён меў з энцыклапедый і кніг. Пра якую кнігу вядзецца тут гаворка? (Пра кнігу «У краіне райскай птушкі»).

2. Гэтая аповесць аўтабіяграфічная, аднак не менш цікавая, як і ўсе кнігі Янкі Маўра. Пісьменніку пашанцавала, што ў яго была добрая, працавітая і вельмі мудрая маці, якая ведала, што сын павінен вучыцца, толькі тады ён стане сапраўдным чалавекам і яму будзе лягчэй жыць. Можна з гонарам сказаць, што мара маці збылася. («Шлях з цемры»).

3. У гэтым рамане апісваецца ход няроўнай барацьбы яванцаў з галандскімі каланізатарамі. Паўстанне пачалося на галандскім ваенным караблі «Саардам». Мірны народ не вытрымаў здзекаў і выступіў на барацьбу за вызваленне. Паўстанне было падаўлена, але яно назаўсёды ўвайшло ў гісторыю вызваленчай барацьбы краіны. Гэта была падзея сусветнага значэння, і пісьменніка яна зацікавіла. Галоўным героем рамана з'яўляецца народ. Пра яго Янка Маўр піша з вялікай сімпатыяй, праўдзіва і шчыра. Цікава апісвае аўтар падарожжа мінгера Піпа, лёс сям'і Па-інго, гісторыю карабля «Саардам». («Амок»).

4. У аповесці многа даведаецеся пра фуінджынцаў, якія ўсё сваё жыццё праводзяць на вадзе: на лодках нараджаюцца, растуць і паміраюць. Хлопчык Манг спрытны, вынослівы, яму хочацца многае пабачыць, шмат аб чым даведацца. Манг ніколі не бачыў сапраўднай зямлі з яе насельніцтвам. Ён робіць такую лодку, каб дабрацца да «зямлі белых». Хоць гэты хлопчык і дзікун, але адразу становіцца зразумела, што ён цікавая і рамантычная натура, і яго шкада, а не тых герояў, якія апынуліся ў трагічным становішчы пасля караблекрушэння. («Сын вады»).

5. У аповесці вы знойдзеце апісанне першабытных людзей. Пісьменнік адзначыў характэрныя асаблівасці паводзін чалавека на найбольш раннім этапе яго развіцця. Слабымі і бездапаможнымі былі гэтыя стварэнні, непадобныя на людзей, яны жылі ў суровым царстве звяроў і дзікай прыроды. Бяззбройныя, без

сваіх хат, яны цалкам залежалі ад прыроды. Паступова першабытныя людзі пачынаюць вынаходзіць прылады працы і самаабароны, атрымліваюць адну перамогу за другой, здабываюць агонь і становяцца больш падобныя да людзей. («Чалавек ідзе»).



6. У гэтай аповесці няма незвычайных падзей і прыгод, але чытаецца яна вельмі цікава, ад яе карысць як ад кнігі А. Гайдара «Цімур і яго каманда», і тэма, можна сказаць, такая ж. Пісьменнік сцвярджае, што не трэба быць вялікім майстрам, каб замяніць электрычную пробку, адрамантаваць крэсла ці прышыць гузік. Гэтыя дробязныя задачы ставяць перад сабой героі аповесці. У гэтым творы няма галоўнай дзеючай асобы, у ёй расказваецца пра жыццё і справы цэлага калектыву дружных, цікаўных і вынаходлівых дзяцей. («ТВТ»).

7. Гэтае апавяданне знаёміць чытачоў з мінулым індыйскага народа, садзейнічае выхаванню ў дзяцей пачуццяў нянавісці да прыгнятальнікаў. («Незвычайная прынада»).

8. Апавяданне пачынаецца паэтычным апісаннем Неапаля, паглядзець на які прыязджаюць багатыя людзі з розных канцоў свету. Пісьменнік паказвае другі Неапаль, у гэтым апавяданні гэта горад беспрытульных і галодных. Прадстаўніком яго з'яўляецца дванаццацігадовы хлопчык лацароні, што ў перакладзе азначае беспрытульны. У Джузепе змарнелы твар, апрануты хлопчык у жудасныя лахманы, выжывае толькі дзякуючы тым манетам, якія кідаюць багатыя турысты. Бедныя дзеці, каб пракарміцца, павінны былі перад багачамі паказваць сцэнкі, танцаваць і спяваць. («Лацароні»).

9. У цэнтры аповесці барацьба чалавека са стыхіяй, напісана на сюжэт рабінзанады. Падзеі аповесці адбываюцца на Палессі ранняй вясной, таму становішча юных падарожнікаў здаецца зусім безвыходным. Аўтар ставіць перад героямі шмат разнастайных перашкод і, паказваючы, як Віктар і Мірон іх пераадольваюць, падкрэслівае смеласць, настойлівасць, аптымізм юнакоў. Хлопцы доўга не могуць выявіць свае ўзаемаадносіны, і толькі прайшоўшы многа выпрабаванняў зразумелі, што яны блізкія сябры. З захапленнем Янка Маўр апісвае беларускае Палессе, край балот і лясоў, многа цікавага гаворыць пра яго своеасаблівы раслінны і жывёльны свет. Пісьменнік як бы пераконвае чытачоў, што не трэба ехаць далёка ў другія краіны, а можна добра адпачыць на Беларусі, дзе ёсць многа цудоўных куткоў, не горшых ад заморскіх. («Палескія рабінзоны»).

*Бібліятэкар.* Яшчэ пры жыцці Янка Маўр стаў класікам беларускай літаратуры. Творы гэтага таленавітага пісьменніка, педагога любяць чытаць не толькі дзеці, але і дарослыя, яны вывучаюцца ў школьнай праграме. Не забывайце, што кнігі Янкі Маўра ёсць у нашай бібліятэцы. Чакаем вас у госці.

**Літаратурны партрэт «Пісьменнік з крылатай фантазіяй»**

*да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра*

*Уступнае слова:*

Сярод старэйшых – найстарэйшы,
Між маладымі – малады,
Між працавітых – самы першы,
Яго не згорбілі гады.
Ён не бразготкі і не цацкі
Дае для моладзі, дзяцей,
А твор, найперш жывы, мастацкі,
Які і кліча, і вядзе.
За томам том, за творам твор –
І чытачоў знайшоў мільён.

Гэтыя словы прысвечаны Янку Маўру – пісьменніку, чыімі творамі зачытваліся вашы дзядулі і бабулі, а пазней таты і мамы. Любяць чытаць іх і сённяшнія школьнікі.

Сапраўднае імя Янкі Маўра – Іван Міхайлавіч Фёдараў. Аб з'яўленні творчага псеўданіма пісьменніка існуе такая гісторыя. У 1926 г., калі Іван Міхайлавіч сабраўся несці сваю першую буйную аповесць «Чалавек ідзе» ў рэдакцыю часопіса «Беларускі піянер», ён падпісаў яе сваім уласным імем і прозвішчам – Іван Фёдараў. Але ўспомніў, што гэта імя ўжо вядомае: так звалі знакамітага рускага першадрукара. І Іван Міхайлавіч падумаў: «Які-небудзь жартаўнік скажа, што ў славутага першадрукара знайшоўся канкурэнт. Значыць, трэба браць псеўданім». Яму прыгадалася ходкая фраза: «Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа ісці». Слова «маўр» прагучала ярка, прыгожа, мнагазначна і, самае галоўнае, таямніча. Сапраўды, хто такі маўр, не ўсякі ведае. (Маўрамі, дарэчы, у даўніну называлі жыхароў Паўночнай Афрыкі). Так настаўнік Іван Міхайлавіч Фёдараў стаў Янкам Маўрам.

Янка Маўр – заснавальнік прыгодніцкага жанру ў беларускай дзіцячай літаратуры. Рознабаковыя веды і багатая фантазія дазволілі яму ў сваіх кнігах «аб'ехаць вакол свету» і пазнаёміць маленькіх чытачоў з Індыяй, Італіяй, Вогненнай Зямлёй, Новай Гвінеяй, Цэйлонам... Захопяць чытачоў сваімі прыгодамі, здзівяць экзотыкай прыроды далёкіх краін аповесці «У краіне райскай птушкі» і «Сын вады». Кнігі гэтыя не толькі цікавыя, але і пазнавальныя, бо Янка Маўр быў настаўнікам геаграфіі і гісторыі, а таму добра ведаў прыроду, жыццё і побыт людзей далёкіх краін, пра якія так цікава і праўдзіва змог напісаць.



Сапраўдным святам для дзяцей стала з'яўленне аповесцей «Палескія рабінзоны» і «ТВТ». Гэтыя кнігі не старэюць і па-ранейшаму захапляюць дзяцей.

У «Палескіх рабінзонах» распрацаваны сюжэт

рабінзанады, якi вядзе свой пачатак ад кнігі Д. Дэфо «Рабінзон Круза», дзе паказана перамога чалавека над стыхіяй. Героі аповесці, звычайныя школьнікі Віктар і Мірон, у час паводкі трапляюць на невялікі востраў, аказваюцца адрэзанымі ад знешняга свету. І толькі дзякуючы сваёй кемлівасці хлопчыкам удаецца ўратавацца.

У аповесці пісьменнік расказвае шмат цікавага аб жывёлах і раслінах Палесся. Ён нанова адкрывае дзецям гэты край беларускай зямлі і пераконвае чытачоў, якія мараць аб далёкіх джунглях, што роднае Палессе не менш багатае і цікавае.

Што такое ТВТ? Гэта – таварыства ваяўнічых тэхнікаў. Яго стварылі вучні аднаго класа, якія ўзяліся змагацца з няўмельствам. Аб тым, як усё адбывалася, лепш прачытаць у кнізе. Шмат было і смешнага, і сумнага. І загалоўкі раздзелаў аповесці пацвердзяць гэта: «Пра тое, як Ніна падрала панчоху»; «Як бацька паляцеў дагары нагамі»; «Як пацук ледзь не ўкусіў Андрэйку за нос, а парсючок сказаў«угу»; «Як Паўлік ехаў на «каўбасе»; «Як маці ваявала з патэльняй»; «Як Клаве трэба было адкусіць цвік» і інш.

Як? Дзе? Што? Чаму? Навошта? – такіх пытанняў у аповесці шмат. І калі вы разам з яе героямі, цікаўнымі, няўрымслівымі, кемлівымі хлапчукамі і дзяўчынкамі, знойдзеце адказы на іх, то і самі станеце такімі ж, як і яны, рупліўцамі.

Кнігі Янкі Маўра перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, латышскую, малдаўскую, армянскую і іншыя мовы. Асобныя яго творы выдаваліся ў замежных краінах: у Чэхаславакіі – «Сын вады», у Амерыцы – «Амок», у Англіі – «Слёзы Тубі», у Кітаі – «Палескія рабінзоны».

Пісьменнік з крылатай фантазіяй, чалавек з добрым сэрцам, Янка Маўр пражыў доўгае жыццё. Ён пайшоў ад нас, калі яму было каля дзевяноста гадоў. Але з намі засталіся яго творы, сабраныя ў чатырох тамах. Жыве ўдзячная памяць аб творцу: імя Янкі Маўра носіць адна з вуліц сталіцы, гэтае імя прысвоена і Мінскай абласной дзіцячай бібліятэцы. Саюз пісьменнікаў Беларусі ўстанавіў Літаратурную прэмію імя Янкі Маўра, лаўрэатамі якой сталі Уладзімір Ліпскі, Уладзімір Ягоўдзік, Уладзімір Мацвеенка, Артур Вольскі, Мікола Чарняўскі.

## ЛІТАРАТУРНЫ РЫНГ ПА ТВОРАХ ЯНКІ МАЎРА
### Конкурс «Ці ведаеце вы жыццёвы і творчы шлях Янкі Маўра?»

1. Якое сапраўднае імя меў Янка Маўр? (Іван Міхайлавіч Фёдараў).
2. Які твор Янкі Маўра пазнаёміў вас з прыгажосцю беларускага Палесся? («Палескія рабінзоны»).
3. Пра каго расказвае першая кніга Янкі Маўра «Чалавек ідзе»? (Пра першабытнага чалавека).
4. У якім творы аўтар узгадвае падарожніка Міклуху-Маклая? («У краіне райскай птушкі»).
5. Як называецца краіна, дзе жыве райская птушка? (Новая Гвінея).
6. Якое апавяданне задумана Янкам Маўрам як своеасаблівы працяг вядомага апавядання Чэхава? («Васька Жукаў»).
7. Як з'явіўся псеўданім пісьменніка?

**Конкурс «Адкуль гэтыя радкі?»**

1. «Толя схапіў кнігу і заняў сваю звычайную пазіцыю ля акна. Уласна кажучы, гэтую пазіцыю лепш было назваць незвычайнай, бо Толя сядзеў, задраўшы ногі на падаконнік, і пры гэтым карыстаўся не ўсімі чатырма ножкамі крэсла, а толькі дзвюма заднімі.

Ён увесь час гайдаўся на гэтых ножках, а часта нават стараўся ўтрымацца на іх, не дакранаючыся нагамі да падаконніка. Што і казаць, практыкаванне было досыць рызыкоўнае... » («ТВТ»).

2. «Далёка-далёка ад нас, на другім баку зямлі, можна сказаць, супраць нашых ног, на поўнач ад Аўстраліі ляжыць вялікі востраў Новая Гвінея. На дзве з паловай тысячы кіламетраў працягнуўся ён у даўжыню і больш чым на шэсцьсот кіламетраў – у шырыню. Тры такія дзяржавы, як Англія, маглі б змясціцца на гэтым востраве». («У краіне райскай птушкі»).

3. «Сідры застаўся жывы. Толькі нагу страціў. Але ж затое за гэтую нагу сям'я кармілася некалькі месяцаў. А потым... потым зноў зажылі, як і раней». («Незвычайная прынада»).

4. «Яны заўжды спрачаліся паміж сабою, але былі найлепшымі сябрамі і жыць не маглі адзін без аднаго». («Палескія рабінзоны»).

5. «Лапы гаспадароў адразу ж пацягнуліся да чарапашак. Разбілі адну, раздушылі другую, а ў трэцяй знайшлі вялізную прыгожую жамчужыну». («Слёзы Тубі»).



6. «Дзіцячы дом стаяў у зацішным кутку, сярод узгоркаў, парослых самымі разнастайнымі дрэвамі – хвоямі, бярозамі, дубамі. Унізе – рачулка, лазнякі, паплавы. Воддалі была чыгуначная станцыя. Гудкі паравозаў сведчылі, што гэты зацішны куток усё ж такі звязаны з шумным светам. А асноўнае насельніцтва дзіцячага дома нават вельмі звяртала ўвагу на гэтыя гудкі: яны напаміналі, што да каго-небудзь з іх можа прыехаць татка або мамка. Але да каго?» («Максімка»).

7. «А сапраўды Сцёпка яшчэ не курыў, а толькі хацеў навучыцца курыць. Ды навука была не такая лёгкая, як, можа, каму здаецца. Гарката пячэ, вочы на лоб вылазяць, а прыемнасці і следу няма. Але ж людзі кураць. І не толькі дарослыя, а і такія, як Скок. Проста зайздрасць бярэ, як гэты Скок пушчае дым праз нос! Ды за адно гэта варта перацярпець пакуту! І Сцёпка са слязамі на вачах цярпеў». («Падарожжа ад школы да дому»).

**Конкурс «Пазнай герояў твораў Янкі Маўра»**

1. «У такі час і трапілі сюды гэтыя два хлопцы. Яны былі аднагодкі і мелі абодва разам гадоў трыццаць пяць. Але выгляд і характары іх былі зусім адметныя. Адзін быў худы, цыбаты дзяцюк, з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі. Другі, наадварот, – прысадзісты, карчасты, чарнявы, з круглым пляскатым тварам». (Мірон і Віктар, «Палескія рабінзоны»).

2. «На каменных прыступках сядзеў хлопчык гадоў дванаццаці і боўтаў нагамі па-над вадою. Чорныя валасы, чорныя вялікія вочы і цёмны загарэлы худы

твар. На плячах кавалкі кашулі, з-пад якой на тры чвэрці галеецца загарэлае цела. Адна калашына ададрана знізу вышэй калена, а другая зусім выдрана збоку». (Джузепе, «Лацароні»).

3. «Гэта быў чалавек гадоў дваццаці шасці з цёмні загарэлым тварам, але светлымі валасамі. Ён то бялеў, чырванеў, то сядзеў нерухома з заплюшчанымі вачыма, хадзіў з кута ў кут. Відаць было, што з ім адбываецца нешта незвычайнае, што ён перажывае нешта большае ад усіх іншых». (Механік Гейс, «Амок».)

4. «Васька зірнуў у акно, дзе калыхалася дрэва з рэшткамі пажоўклых лісцяў, і ўявіў, як жывога, свайго дзеда. Высокі, з шырокімі плячыма і вялікай белай барадой, здаецца, ніколі не злаваў, не крычаў, а толькі жартаваў». (Дзед Іван Сцяпанавіч, «Васька Жукаў»).

5. «Маленькі круглы хлопчык, з вострым носікам і вочкамі, як у вожыка, лічыўся ў піянератрадзе пасіўным грамадзянінам. Калі якая гульня, то ён быў вельмі актыўны калі трэба было выканаць якое-небудзь заданне атрада, то стараўся ўхіліцца ад яго». (Бора Цыбук, «ТВТ»).

6. «Малы, рыжы, увесь у рабацінні, вочы светлыя, адкрытыя – і пра яго ніхто не сказаў бы, што ён думае». (Сцёпка Сідорык, «Падарожжа ад школы да дому»).

7. «Гэта быў капітан ваенна-паветраных сіл, чалавек гадоў пад сорак. У яго быў сухі твар з вострым падбародкам, вострым носам, з тонкімі сціснутымі губамі, тонкімі бровамі і вузкімі вачыма. Усё гэта надавала яму нейкі калючы выгляд». (Фрэнк Боўтар, «Апошні вылет»).

**Конкурс «Што? Дзе? Калі?»**

1. Як называецца ваенны карабель, на якім пачалося паўстанне супраць галандскіх камандзіраў? («Саардам»).
2. Дзе і ў якім годзе адбылося паўстанне на караблі «Саардам»? (Востраў Ява, 1926 г.)
3. Які твор пісьменнік прысвяціў гэтым трагічны падзеям? («Амок».)
4. Як называюць востраў Яву ў Еўропе? (Жамчужына галандскай кароны.)
5. Як называецца дыня, якая расце на дрэве і ўнутры якой знаходзяцца зярняткі, падобныя на ікру рыбы (Папайя.)
6. Што гэта за дзівосная кветка: велічынёй яна з добрае кола, бутоны як качаны капусты; жывіцца кветка каранямі іншых дрэў, мае вельмі непрыемны пах? (Рафлезія).
7. Як называецца галоўнае адзенне малайца – кавалак тканіны, абкручаны на манер спадніцы? (Саронг).



*У канцы літаратурнага рынга падводзяцца яго вынік пераможцы ўзнагароджваюцца.*

***

## Віктарына «Пазнай маўраўскіх герояў па апісанні»

1. «…вызначаўся адзін мужчына трохі вышэйшага росту, відаць, дужэйшы за іншых і нават здавалася, нібы з твару разумнейшы» (Павадыр, важак, аповесць «Чалавек ідзе»).

2. «…худы, цыбаты дзяцюк, з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі» (Мірон, аповесць «Палескія рабінзоны»).

3. «…чалавек сярэдняга росту, жоўты, з вузкімі касымі вачыма» (Чунглі, аповесць «У краіне райскай птушкі»).

4. «Гэта быў чалавек гадоў дваццаці пяці, апрануты ў вельмі дзіўную вопратку: яна была пашыта з птушыных шкурак» (Нгара, аповесць «Сын вады»).

5. «Гэта быў немалады ўжо, але юркі, хітры, дасціпны чалавек з бегаючымі вочкамі і казлінай бародкай» (грэк Кандаракі, аповесць «У краіне райскай птушкі»).

6. «…прысадзісты, карчасты, чарнявы з круглым пляскатым тварам» (Віктар, аповесць «Палескія рабінзоны»).

7. «…высокі мужчына, гадоў пад сорак, чысты, голены твар яго выказваў гордасць і самаўпэўненасць. Ён заўсёды быў спакойны» (містэр Скот, аповесць «У краіне райскай птушкі»).

### Рэкамендуем наступныя формы і назвы мерапрыемстваў

да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра:

Назвы:

- «Добры і мудры настаўнік»
- «Ён пісаў добрыя кнігі»
- «Капітан нашых падарожжай - Янка Маўр»
- «Летуценнік з краіны райскай птушкі»
- «Мастацкі космас Янкі Маўра»
- «Мудрэц з душою хлапчука»
- «Мысліцель і летуценнік»
- «Нястомны вандроўнік»
- «Чалавек з крылатай фантазіяй»
- «Чараўнік з краіны маленства»
- «Янка Маўр. Рамантык. Падарожнік. Педагог»

Формы:

- Вечарына-партрэт
- Гутаркі, агляды жыцця і творчасці
- Дыялог-роздум
- Літаратурна-музычныя кампазіцыі
- Літаратурная гасцёўня
- Літаратурны вечар
- Літаратурны урок
- Урок выдатнай асобы
- Электронная прэзентацыя
- Юбілейны вечар



**Спіс літаратуры:**


1. Барсток, М. М.  Віднейшы беларускі дзіцячы пісьменнік Янка Маўр/ М. М. Барсток. – Мінск: Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Беларускай ССР, 1958. – 32 с.
2. Беларускія пісьменнікі (1917-1990): Даведнік; Склад. А. К. Гардзіцкі. Нав. рэд. А. Л. Верабей. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. – 653 с.: іл.
3. Гурэвіч Э. С. Янка Маўр // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. – Минск, 1999 Т. 2: 1921-1941. – С. 747-770.
4. Гурэвіч, Э. С. Беларуская дзіцячая літаратура (1917–1967) / Э. С. Гурэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 312 с.
5. Гурэвіч, Э. С. Янка Маўр: нарыс жыцця і творчасці/ Э. С. Гурэвіч ; рэдактар П. К. Дзюбайла; прадмова З. У. Драздовай. – 2-е выданне, дапоўненнае. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 150 с.
6. Канэ Ю. М. Мавр, Янка// Кароткая літаратурная энцыклапедыя/ Под ред. Суркова А. А. — М.: Сов. энциклопедия, 1967. – Т. 4. – С. 487.
7. Маўр Янка// Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т./ пад рэд. А. І. Мальдзіса. – Мн.: БелЭн, 1992-1995.
8. Миронов А. Дед Мавр/ А. Миронов. – Минск: Мастацкая літаратура, 1979. – 168 с.
9. Рунец, П. Чалавек з крылатай  фантазіяй / Пятро Рунец. – Мінск: Народная асвета, 1979. – 64 с.: іл.
10. Яфімава, М. Б. Цэлы свет – дзецям: творчы партрэт Янкі Маўра / М. Б. Яфімава. – Мінск: Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1983. – 136 с. : іл.
11. Яфімава, М. Б. Янка Маўр: (жыцце і творчасць)/ М. Б. Яфімава. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1960. – 128 с.

**Артыкулы:**


1. Бярозка, У. З крылатай фантазіяй: [аналіз творчасці Янкі Маўра]/ Уладзімір Бярозка// Віцебскі рабочы. – 1991. – 6 верасня. – С. 7.
2. Васілевіч, А. Рамантык–гуманіст: [аб жыцці і дзейнасці Янкі Маўра]/ Алена Васілевіч// Васілевіч, А. Люблю, хвалююся – жыву/ А. Васілевіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1996. – С. 62-71.
3. Васілевіч, А. Рамантык–гуманіст: [жыццёвы і творчы шлях Янкі Маўра]/ А. Васілевіч// Алеся. – 2003. – № 5. – С. 37.
4. Гардзіцкі, А. Янка Маўр – жартамі і сур’езна/ А. Гардзіцкі// Гарадзіцкі, А. Сустрэчы/ А. Гарадзіцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1972. – С. 55-64.
5. Грахоўскі, С. Мудрэц з душою хлапчука: [аб жыцці і дзейнасці Янкі Маўра]/ С. Грахоўскі// Грахоўскі, С. Так і было: артыкулы, успаміны, эссе/ С. Грахоўскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – С. 164-167.
6. Грышкова, І.М. Пісьменнік з крылатай фантазіяй: урок пазакласнага чытання па творчасці Янкі Маўра/ І.М. Грышкова// Пачатковая школа. – 2003. – № 4. – С. 29-30.
7. Давідовіч, Г. Мысліцель і летуценнік: [Янка Маўр]/ Генрых Далідовіч// Краязнаўчая газета. – 2008. – № 8. – С. 3.
8. Зубоўскі, Б. Другое чаканне Маўра / Б. Зубоўскі // Настаўніцкая газета. – 2001. – 19 ліпеня. – С. 1, 3.
9. Зубоўскі, Б. Урокі і запаветы Янкі Маўра/ Б. Зубоўскі// Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 8. – С. 61-64.
10. Зубоўскі, Б. Янка Маўр: мастацкі матывацыйны вопыт першапраходцы/ Б. Зубоўскі// Роднае слова. – 2012. – № 5. – С. 17-21.
11. Кавалёва, Т. Ліст у будучыню: [Янка Маўр]/ Т. Кавалёва// Настаўніцкая газета. – 1999. – 16 кастрычніка. – С. 4.
12. Кавальчук, Т. Капітан нашых падарожжаў: да 130-годдзя Янкі Маўра/ Т. Кавальчук// Бібліятэка прапануе. – 2013. – 11 лістапада. – С.27-30.
13. Карабановіч, Э. Школьны літаратурны музей Янкі Маўра/ Эдвард Карабановіч// Роднае слова. – 2003. – № 4. – С. 103.
14. Кузьміч, Н. Усе мы дзеці прыроды: апавяданне «Багіра» Янкі Маўра/ Наталля Кузьміч// Роднае слова. – 2008. – № 5. – С. 5-6.
15. Курбека, І. Адзін вечар з Янкам Маўрам/ І. Курбека// Звязда. – 2003. – 14 мая. – С. 8.
16. Міцкевіч, Н. Доўгая дарога: [жыццёвы і творчы шлях Янкі Маўра]/ Наталля Міцкевіч// Полымя. – 2011. – № 3. – С. 159-177.
17. Рублевская, Л. 125 лет Янке Мавру/ Людмила Рублевская// Советская Белоруссия. – 2008. – 7 июня. – С. 14.
18. Садоўская, Л. Капітан нашых падарожжаў Янка Маўр/ Л. Садоўская// Бібліятэка прапануе. – 2003. – № 2. – С. 11-13.
19. Свінарэнка, В. «Партрэт Янкі Маўра»/ Вольга Свінарэнка// Роднае слова. – 2002. – № 9. – С. 102, 103.
20. Федарэнка, А. Мой Янка Маўр/ А. Федарэнка// Бярозка. – 2003. – № 5-6. – С. 28-29.
21. Хацько, С. Любімы дзіцячы пісьменнік : [жыццёвы і творчы шлях Янкі Маўра]/ С. Хацько// Голас Радзімы. – 1998. – 4 чэрвеня. – С. 6.

22. Чыгрын, С. Праз вобразы Янкі Маўра/ С. Чыгрын// Настаўніцкая газета. – 1986. – 20 снежня. – С. 13.
23. Янка Маўр// Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзя (20-50-я гады)/ пад агульнай рэдакцыяй М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – С. 455-476.
24. Янка Маўр: для дзяцей// Беларуская дзіцячая літаратура: вучэбны дапаможнік/ пад рэдакцыяй А. М. Макарэвіча, Б. М. Яфімава. – Мінск: Вышэйшая школа, 2008. – С. 197-220.
25. Яфімава, М. «Чую біцце чалавечага сэрца»: згадкі пра Янку Маўра/ Маргарыта Яфімава// Роднае слова. – 2003. – № 5. – С. 90-93.
26. Яфімава, М. Дзіцячых сэрцаў уладар…: [аб жыцці і творчасці Янкі Маўра]/ Маргарыта Яфімава// Роднае слова. – 2008. – № 5. – С. 3-4.
27. Яфімава, М. Ён пісаў добрыя кнігі: [аб жыцці і творчасці Янкі Маўра]/ Маргарыта Яфімава// Бібліятэка прапануе. – 2009. – № 4. – С. 22-24.
28. Яфімава, М. Сустрэчы з Янкам Маўрам/ Маргарыта Яфімава// Пачатковая школа. – 2003. – № 4. – С. 23-24.
29. Яфімава, М. Шляхамі роднай Беларусі: аповесць «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра/ Маргарыта Яфімава// Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 30-32.

Складальнік: Андык Н.М.

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу